## ПРАДМОВА

24–25 сакавіка 2022 года кафедра славянскай філалогіі правяла онлайн-канферэнцыю прысвечаную вывучэнню праяў нацыянальнага характару і нацыянальнай ідэнтычнасці ў мове, літаратуры і культуры. Да ўдзелу былі заяўлены больш за 90 дакладаў выступоўцаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Узбекістана і Польшчы.

Інтэграцыя гуманітарных ведаў выступае актуальным напрамкам даследаванняў. Звесткі з лінгвістыкі, літаратуры, этнаграфіі, лінгвакультуралогіі ў сукупнасці даюць магчымасць выявіць адметную культурную інфармацыю, атрымаць атрымаць рознабаковае ўяўленне пра з'яву нацыянальнага характару. Разгляд нацыянальна-культурнага кампанента на розных узроўнях назапашвае ўяўленні пра культурную ідэнтычнасць.

Аспекты Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальны характар і спосабы яго ўвасаблення ў культуры і мове ва ўмовах мульцікультурнага асяроддзя» былі прадстаўлены наступнымі секцыямі:

– праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці і нацыянальнага характару ў рускай і беларускай літаратуры і мастацтве;

– праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці і нацыянальнага характару ў замежнай літаратуры і мастацтве;

– нацыянальныя аспекты міжкультурнай камунікацыі;

– моўныя сродкі ўвасаблення нацыянальнага характару;

– метадычны патэнцыял нацыянальнага кампанента пры вучэнні рускай мовы як замежнай,

– моўная карціна свету і праблемы міжкультурных зносін.

Матэрыялы, прадстаўленыя ў гэтым выданні па выніках навуковай імпрэзы, засведчылі, што тэма канферэнцыі не вычарпала сябе і ў кантэксце новых полікультурных і глабалізацыйных выклікаў у кожны новы перыяд матэрыял для асэнсавання чакае свайго даследчыка.

***С. М. Лясовіч***